Уладзімір Мароз

# Графічная кніга паэта

Вершы, кампазіцыі



Уладзімір Мароз

# Графічная кніга паэта

Вершы, кампазіцыі

Выдавец
Зміцер Колас

Мінск
2018

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
М28

Мастак Уладзімір Мароз
На 2-й старонцы:
сяброўскі малюнак
кінарэжысёра Вадзіма Сукманава

**Мароз**, У. В.

М28 Графічная кніга паэта. Вершы, кампазіцыі / Уладзімір Мароз. — Мінск : Зміцер Колас, 2018.— 200 с.
ISBN 978-985-6992-13-4

У “Графічнай кнізе паэта” пад адной вокладкай сабраныя вершы і графічныя кампазіцыі аўтара, архітэктара па першай адукацыі. Гэтае своеасаблівае выданне сведчыць аб тым, што ў жыцці і творчасці нічога не бывае выпадковым, што мастацкая адукацыя аніяк не можа знікнуць бясследна, у пэўнай ступені яна дадае адценні творчай палітры пісьменніка. І паэтычныя радкі, і графічныя лініі ў кнізе суіснуюць у суладдзі, кожная мастацкая сутнасць па-свойму выяўляе грані творчай асобы Уладзіміра Мароза ў медытатыўнай, настраёвай плыні.

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5

**ISBN 978-985-6992-13-4**

© Мароз У. В., 2018.
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2018.

# І крэсліць неўсвядомлена рука…

І ўсё ж гэтая кніга патрабуе пэўных тлумачэнняў. У старэйшыя школьныя гады я маляваў мініяцюркі ў рэалістычным стылі на старонках сваіх запісаў у агульных сшытках. Іх было тры, тых сшыткаў падлеткава-юнацкіх зацемак, роздумаў, развагаў, але яны згінулі ў пажары, калі гарэла бабіна хата. Маляваў там салдаціка з волава, кветку, фігурку якую і шмат чаго іншага. Сюжэтаў хапала на кожны запіс. Пазнейшая абстрактнасць (калі хочаце, сюррэалізм) пайшла ад студэнцтва, на архітэктурным факультэце нашага тады Беларускага політэхнічнага інстытута. Ці то пасля ўчарашняга, ці загаманіліся позна, ці ноч не спаў за праектам – сядзіш, бывае, на лекцыі, канспект пішаш, як і належыць, але стома дае знаць сваё, падбіраецца Марфей, ты правальваешся ў іншы стан. І рука ў канспекце ўжо не сказы выводзіць і словы, а рыскі нейкія, закрэсліны, пакуль зусім не спыніцца, калі ты на момант трапіш у палон сну.

Потым, як глянеш на канспект – сорам! Невядома што ў канцы тэксту, крэмзаніна. А канспект павінен быць прыгожым. Таму і пачынаеш замалёўваць свае паўсонныя выкрунтасы плямкамі, зграбнымі лініямі – быццам ты спецыяльна (а не вымушана з дрымоты) вымаляваў гэтыя кампазіцыі. А што лекцыі маюць такім чынам сэнсавыя прагаліны, лакуны – тое не бяды, у кнігах дачытаю ці ў дзяўчатак сваіх вазьму акуратны канспект. Тое ж працягвалася і ў Літаратурным інстытуце.

Пасля канспекты пісаць ужо не трэба было, але звычка абстрактна маляваць засталася. Кампазіцыі сталі з'яўляцца свядома-падсвядома. Сядзіш, думаеш аб нечым, ці размову вядзеш неабавязковую, ці слухаеш непатрэбнае табе (напалову адсутны ў рэальнай прасторы), а рука самахоць неўсвядомлена крэсліць на аркушыку паперы лініі, плямкі, штрыхі, зводзіць іх у кампазіцыю.

Яны ніколі не задумваліся наперад – проста сама рука пачынае весці нейкую адмысловую лінію – адну, другую. Потым, на пэўнай стадыі, глядзіш, натуральна, што атрымліваецца, нешта даводзіш ужо больш асэнсавана, каб кампазіцыя выглядала па-мастацку завершанай, гарманічнай, прыгожай – на тое яна і кампазіцыя. Тут ужо водгук архітэктурнай адукацыі. Напэўна, ніколі не згасала больш падсвядомае, чым неабходнае, жаданне маляваць, крэсліць, шукаць гармонію графічна. Бо архітэктура, дойлідства – гэта і ёсць кампазіцыя, мы нават асобны такі прадмет вывучалі, ды і адзнаку па курсавых праектах ставілі нам асобную, у шэрагу іншых, за кампазіцыю.

Пасля завершанасці пачынаеш прыдумваць, знаходзіць, выштукоўваць назву. Тое ўжо ад літаратуры. Працэс гэты я вельмі люблю. Шматлікія назвы вершаў, больш нешматлікія назвы празаічных і эсэістычных тэкстаў, дакументальных маіх фільмаў, лічаныя назвы кніг. У гэтым шэрагу і назвы графічных мініяцюр, зробленых звычайнай шарыкавай ручкай (а не тэхнічнымі мастацкімі сродкамі) на невялічкіх аркушыках паперы.

Але якая кніга без тэкстаў? – гэта будзе проста альбом. Таму сюды ўключаны і вершы – несюжэтныя, медыятыўныя, настраёвыя. Як і кампазіцыі.

Уладзімір Мароз.

## ЧЫРВОНЫ РАДОК

*Радок чырвоны новага жыцця*
*Даверыш рупна аркушу паперы.*
*Усёй душою прагнеш адкрыцця*
*Любові вечнай, шчырасці і веры.*

*Але наўсцяж самота небыцця,*
*У новы свет зачыненыя дзверы.*
*Знік першародны водар пачуцця,*
*Час ненадзейны, прыцемкавы, шэры.*

*Праз кола дзён на згубу не зважай,*
*Ары і сей, твая такая доля,*
*І дачакаеш – вырасце ўраджай.*

*Дзе светлы край, на ростанях дарог,*
*Наўзбоч згрызот, сумненняў і трывог*
*Цябе жадана перастрэне воля.*

*2007*

# ВОЛЯ І НЯВОЛЯ

*Няволя й воля – стан душы.*
*І ўсё, і болей анічога.*
*Яны ніяк не спарышы*
*Спаміж дарункаў пана Бога.*

*Яны – два берагі ракі,*
*Калі з жыццёвае праявы.*
*І выбар ёсць якраз такі:*
*Твой бераг левы а ці правы?*

*Куды нарэшце даплывеш,*
*Такой і выспеліцца доля.*
*Усё ў душы тваёй найперш –*
*Ці будзе воля, ці няволя.*

*2011*

# ШЛЯХ

*Напроста шлях, а там і паваротка,*
*І нават паказальніка няма.*
*Крыжы на ростанях прапалі незваротна –*
*Цяпер людзей няцяжка ўвесці ў зман.*

*Дарога ёсць, але такая справа:*
*Наперад пойдзеш – тлумнасці багно.*
*Ідзі налева, хоць сабе направа,*
*Адзіны скутак – бездараж адно.*

*Дарога ёсць, напэўна, быць не можа,*
*Яснее шлях да праўды напрасткі.*
*Але знайсці яго хто дапаможа?*
*Ніхто, як сам… –*
*Падумай, ды ідзі.*

*1988*

## ЗНАК

*Пяшчоты хваля будзённасць змые –*
*Гадзінай боскай адны ў сусвеце.*
*І срэбны крыжык на белай шыі*
*Паўцемру раптам няўзнак асвеціць.*

*Няхай не вераць зладзеі ў Бога –*
*Іх час таксама начной пароюю.*
*Але не ўкрадуць цяпер нічога,*
*Бо Ён за міласць стаіць гарою.*

*Святой часінай любоў ратуе,*
*Дарогай простай падкажа выйсце.*
*Ад злога свету нас крыж вартуе –*
*Няхай так будзе, пакуль ісці нам.*

*1991*

# ДРУГОГА НЕ ДАДЗЕНА

*На пагорак ускіне дарога –*
*І з царквою ў паднеб'е ляціш.*
*Нам не дадзена нават другога,*
*Шлях любові – адзіны ў жыцці.*

*З тым ідзі на прастор сіняплынны,*
*Да радзіннага дому свайго,*
*Дзе салодкі плыве дым Айчыны –*
*Анікому не выдзьмуць яго.*

*І таму супакой невымерны*
*На сямі еўрапейскіх вятрах.*
*Мітусіцца бязладна няверны,*
*"Быць – не быць" яго кідае ў жах.*

*Нас такія сумненні мінаюць,*
*У суладдзі душу беражы.*
*На расстайных сцяжынах трымаюць*
*Знакі Божай любові – крыжы.*

*1994*


ПРЫЛАДА 1991


07.09.94.


Хвалісты крыж
30.09.08.


зачатіща
22.01.16. XX


XX 09.10.07
скрыжаванне


Калі здалі
«Чарнобыльскі крыж»
02.03.06.


Кругі па вадзе
25.10.07.



СУПЛЁТ 29.01.2016. ХХ


АБЫ ЖА 16.08.10.


16.10.2007.
пад ветрам


08.06.07



ЛЁГКАСЦЬ
ХХІ 22.07.08.


Парасон УМ 21.12.2015г.


XX 20.08.2012



нажыўка

XX 04.08.11.



НА ТРОХ СТРЫЖНЯХ 04.02.11.



пахіліўся ХХ\ 04.02.2011.



гойданка
16.07.08.


стаіць
XX 11.07.08.


тры кроплі
11.01.05




ЗАКУТЫ КЛЮЧ
16.11.07г.


2.9.87г.


радасць вады
29.09.08.


Двое-адзін
амбівалентнасць
04.05.06.

## КРЭДА

*Няможна спаць,*
*хвілінай адцурацца*
*Жыцця свайго,*
*сумненняў і згрызот,*
*Бо можа стаць,*
*бо можа проста стацца,*
*Што згінеш сам,*
*пазбегнуўшы турбот.*

*Нашто тады гарэў агонь спякотна,*
*Нашто кахаў і верыў, чыстым быў?*
*Спатольна даць,*
*даць проста, незваротна*
*Усім цяпло,*
*каго калісь любіў…*

*1975*

# ВЕТРЫК АРЭЛЯЎ

*Казку летняга дня не прымроіла, не –*
*Лёгкі ветрык арэляў схапіў нечакана.*
*Штось на вуха пяшчотна нашэптваў ён мне,*
*Называў непаўторнай, адзінай, абранай.*

*Спакушаў ён на ўзлёце цнатліва зграшыць,*
*Зблытаў думкі і сам заблудзіўся ў спадніцы.*
*Аддалася яму без ваганняў душы,*
*Каб дастаць асалоды з гаючай крыніцы.*

*Сум нязбыўны растаў, бы пад сонцам туман,*
*Спаталенне жадання прымружыла вочы.*
*Мрояў дзіўных спрадвечны салодкі падман,*
*Лёгкі ветрык арэляў, спакуснік жаночы…*

*1994*

## АЎТАПАРТРЭТ

*Наўпроста глядзі, не наўскоса, –*
*Партрэт пачынаюць мой з носа,*
*Калі за аловак бяруцца.*
*Не супраць зусім – беларус я,*
*Усцешаны явай, што маю*
*Адметнасць бульбянага краю.*

*Убачыш яшчэ ў Беларусі*
*Павеў валасоў светла-русых,*
*Што хваляй сцякаюць на плечы,*
*Пяшчотна шапочуць аб нечым.*
*Вусы, валасы на малюнак –*
*Мастацтву ізноў падмацунак.*

*Пра колер вачэй мой блакітны*
*Згадала, каханая, ты мне*
*Хвілінай прызнання, пяшчоты.*
*І сам я разгледзеўся потым:*
*Відаць там цікаўнасць жывая,*
*Што прагна ўвесь свет убірае.*

*Яшчэ маршчакі, рысы часу,*
*Разгладзіць іх хочацца прасам –*
*Ды толькі не трэба, даволі*
*Нядолі ў жыцці, як і долі.*
*Маё застанецца са мною*
*І звыкласцю, і навіною.*

*1978, 2016*

## ВЕСТКА

*То не птушка ў акно заляцела, –*
*Хто, не скажам, нам вестку прынёс.*
*Прадчуванне душа перастрэла,*
*Быццам тут вырашаецца лёс.*

*Мы чакаем і цуды, і дзівы,*
*Вось,  нарэшце, – і пойдзе жыццё,*
*Час надарыцца светла-руплівы,*
*Шчасце дасць, прынясе адкрыццё.*

*А таго нам не ўцяміць адразу,*
*Што жыццё не чакала, ішло,*
*Зло з дабром спавіваючы разам,*
*Як патрэбна было, як магло.*

*Можа, лепшае ўжо і збылося,*
*І яго нам не трэба шукаць.*
*Мо няшмат у жыцці засталося –*
*Дык навошта, здаецца, чакаць?*

*1988*

## ПЛАЧ НЕМАЎЛЯЦІ

*Над калыскай турботна схілілася маці*
*Ашчадзіць птушанятка сваё ад завей.*
*Гэта жальба-журба, гэта плач немаўляці*
*Сярод ночы падняў супакоіць хутчэй.*

*Плача хлопчык маленькі адчайна і скрушна –*
*Той часінай святое згарае ў агні.*
*Гэта плач немаўляці па згубленых душах,*
*Расцярушанай светам былой чысціні.*

*Не пачуе яго, хто згубіў сваё сэрца,*
*Хто не ў стане трывогу і смутак адчуць.*
*Гэта плач немаўляці – душа скаланецца,*
*І да раніцы болей ужо не заснуць.*

*Кожны з нас за грахі па рахунку заплаціць,*
*Незваротна сваю атрымае юдоль.*
*Я трываць не магу гэты плач немаўляці –*
*Лепш бы сам нёс заўжды яго крыўду і боль.*

*Проста сёння пакуль у тваіх яшчэ сілах*
*Да грудзей прыхіліць, ахінуць цеплынёй.*
*Гэта плач немаўляці на роспачных крылах*
*Прадчуваннем ляціць над збалелай зямлёй.*

*Будзе слёзаў даволі ў жыцці, без сумнення,*
*За адкрытасць адплата, каханне й давер.*
*Гэта плач немаўляці, застылась імгнення,*
*Маё сэрца дазвання вярэдзіць, ірве.*

1995

# РАСТУРЗАНАСЦЬ

*Набірае пад сонцам жыццёвае моцы калоссе,*
*Новым парасткам сёння належыць уся дабрадаць.*
*Я сябе аддаваў, што ж цяпер ад мяне засталося? –*
*У пустэльні душы ані каліва больш не відаць.*

*Што мне смак успаміну пра чуласць сваю і спагаду,*
*Калі рваць на кавалкі бяззбройнага ўсе мастакі,*
*Калі шчырасць наскрозь сустракае няўдзячнасць і здраду?*
*Парассыпаны перлы, ды сумна адно – перад кім?*

*Не стагні, не крычы, раз на долю такую абраны,*
*Бо яшчэ не мяжа, Госпадзь мудра па сілах дае.*
*Адыйсці, адпаўзці – загаіць набалелыя раны,*
*Ды каханай любоўю сплаціць за знікненні свае.*

*1995*

# ТУМАНОВАЕ КОЛА

*Густы туман каўтае першы снег,*
*З'ядае прагна, люта, ненажэрна,*
*Праявіць бруд, прысыпаны наспех –*
*Тым цысціню заб'е неміласэрна.*

*Будзённы тлум знішчае твой імпэт,*
*Да шчасця глуха зачыняе дзверы.*
*І не згадаеш, быў ці ты паэт,*
*Які кахаў, надзеяй жыў і верыў.*

*Суворы час, калі ніхто з табой*
*Да прышласці любові не пакрочыць.*
*Спрэс блуд душы, разлад і непакой –*
*Туманам дні падроўнены да ночы.*

*Але душа ўсё прагне любаты,*
*Ружовых мараў, пекнасці і шчасця.*
*Калі ж, калі бязладдзем нематы*
*На дабрадаць адведаем прычасця?*

*Быў першы снег – і вось яго няма,*
*Меў чысціню, а сёння енчыш: дзе я?*
*Туманных дзён адольвае гурма –*
*Што твой адказ і што твая надзея?*

*2002*

## ІНШАСВЕТ

*О, несамотныя мясціны,*
*Дзе нас няма, дзе проста рай!*
*Наўзбоч будзённай каляіны*
*Недасягальны небакрай.*

*Туды лятаюць самалёты,*
*Але бракуе на білет.*
*Усё адкладваеш на потым –*
*Няхай чакае дзіўны свет.*

*Дзе ззяюць колеры вясёлкі,*
*Спявае мора-акіян.*
*Лагодныя пястуюць золкі,*
*Вяртання мары светлай стан.*

*О. несамотныя часіны! –*
*Там мы былі, там нас няма.*
*Ніхто нікому тут не вінны,*
*Пяшчота спеліцца сама.*

*Яшчэ наперадзе каханне,*
*Усе шляхі перад табой.*
*Калі надарыцца адхланне*
*Парой дзяцінства залатой?*

*Заўжды праз нешта забракуе*
*Купіць да шчасця той білет.*
*Так недасяжна і красуе*
*Нязнана-знаны іншасвет.*

*2004, 2012*

## ШЛЯХЦЯНКА-ВОСЕНЬ

*Шляхцянка-восень, я з табой блукаю*
*Па мяккіх сцежках страчанага раю.*
*Шляхі заслала згубленай лістотай,*
*Пякуча вабіш неспазнанай цнотай.*

*Брыду з табой, агорнуты пяшчотай,*
*Пачуюся абранаю істотай.*
*Мне аднаму сягоння фарбы краю –*
*Малюнкаў восеньскіх альбом гартаю.*

*Шпацыр вядзе нас ціха спаміж дрэў –*
*Дастаць спакою я даўно хацеў,*
*Калі з сабою кліча неба просінь.*

*Агонь жаданняў-дум не дагарэў,*
*Вярэдзіць тайнай горні песняспеў –*
*Не пакідай мяне, шляхцянка-восень.*

*2002*

## ШЛЯХ МАЙСТРА

*Надыходзіць пара,*
*Надараецца час,*
*Калі робіцца ўсё пустазвонным.*
*Майстру трэба спакой,*
*Ён стаміўся ад вас,*
*Вашай прагі аб хлебе надзённым.*

*Ператрусаў ліхіх*
*Не сціхае прыбой –*
*Ён знямогся ад жорсткасці свету.*
*Для падбітай душы*
*Майстру трэба спакой,*
*Каб не збочыць свайго запавету.*

*Да аблуды наўпрост*
*Пуцявіна вяла –*
*Чалавецтва датупала краю.*
*Майстру трэба спакой*
*Зла наўзбоч і дабра –*
*Ён не хоча ні пекла, ні раю.*

*Майстру трэба спакой,*
*Каб сваё адпісаць,*
*Наастачу адкінуць змаганне.*
*А Гасподзь пашкадуе,*
*Дашле дабрадаць –*
*За знявагі і крыўды адхланне.*

*Майстру мроіцца дом*
*Па-над ціхай ракой,*
*Дзе да неба дарога адкрыта.*
*Больш нікога наўкол.*
*Майстру трэба спакой,*
*Ды каханне яго, Маргарыта.*
*2004*


Завязь
1.02.88 ВВМ


Імклівая птушка
15.03.01г




танцы
26.04.07.



ЭРАТЫЧНЫ МАТЫЎ УЛ 22.10.2001.


пасярэдзіне
15.06.09.



10.10.07.
Пункт прыпынку



НАРАДЖЭННЕ ХХІ 14.01.2012



11.10.2007
прысесці


спакуса
1.11.2002 г.




15.05.2006г


свечка
17.10.07


завіхрэнні
у беларуска-савецкім
жыцці
ЖЛ 2.03.04.


зачапілася
15.01.10,


заглытнуў XX 15.04.16.



ТРЫ XX 28.01.10.


ДЗЮБА


Кропля
24.09.08


закатаць
03.06.09.


шаткая песня
18.09.57г.



пульхна

ХХ 26.09.08.


ХЯЦІЦЬ РАЗАРВАНАЕ КОЛА...
09.10.87



ГУРБЫ СНЕГУ ХХЛ 07.12.2012

## КАЛЯ КРАЮ

*Здаецца, ёсць інакшае жыццё,*
*Дзе людства свет трымаецца на праўдзе,*
*Дзе годнасці трывае пачуццё,*
*І па любові ўсё, а не па здрадзе.*

*Дзе рай зямны, змястоўе добрых спраў,*
*Праз дзён смугу што бачны ледзьве-ледзьве.*
*Такіх дзівосных сонечных праяў*
*Карціць вачыма хоць аднойчы згледзець…*

*Ахамяніся, брат, самападман,*
*Не лепшыя для сэрца тыя лекі.*
*Яны душу не вылечаць ад ран,*
*Бо людзі ўсюды сутнасць чалавекі.*

*Бо ўсюды тло, нязбыўнасць і адчай,*
*Быццё зямное нахіляе долу.*
*І не суцішыш сум – перачакай,*
*Даберажы ў душы агеньчык кволы.*

*Агеньчык той, узвышанай любві,*
*Якой імкнеш засмяглаю душою.*
*Яе надзеяй, верай наталі,*
*Тады і будзе іншасвет з табою.*

*2011-2012*

## ЗГАДКІ СТРАЧАНАГА РАЮ

*Вярэдзяць згадкі страчанага раю:*
*Сцяжынка, хутар, некрануты гай,*
*Дзівосаў светлых повен родны край –*
*Спазнанняў першых смак успамінаю.*

*Але дарма маленства я гукаю,*
*Якім ключом яго не адмыкай –*
*Закрыта брама на дарозе ў рай,*
*Іржа наўкол самоты і адчаю.*

*Сувора так накоціцца жыццё,*
*Пакуль не сыдзе зверху адкрыццё –*
*Усё з табой і ўсё ў табе праз годы.*

*Тады шляхі ў адну сплятуцца ніць,*
*Бо Ім наўсцяж пастаўлена любіць,*
*Свой райскі кут акрэслю назаўсёды.*

*1988*

## ДА СУЛАДДЗЯ

*Адбівае паэзію тлум,*
*Мітусня ды старанне выжыць.*
*Непатрэбна-нязбыўны сум*
*Падкрадзецца лісіцай рыжай.*

*Каб украсці твой сыр-гаюн,*
*Каб надзею згубіў і веру,*
*І забыўся, што быў пяюн,*
*Словам светлым крапіў паперу.*

*Як ліса, так і сум – падман,*
*Не зняволься яму паддацца.*
*Разгайдана-няпэўны стан*
*Ненадзейны цяпер дарадца.*

*Акажыся мудрэй, вышэй,*
*Як мага, паімкні да волі.*
*Перамогамі будзь дужэй,*
*У суладдзі шукай спатолі.*

*Лісцем сонца залоціць след,*
*Восень цёплыя фарбы кіне.*
*Твой адзіна-чароўны свет*
*Прамінецца, але не згіне.*

*Беражы ты яго, сябе*
*Цудадзейна-няўлоўным словам.*
*Адначасна ў жніве-сяўбе*
*Праяўляешся сэнсам новым.*

*2001*

# ЧЫН ШЛЯХУ

*Калі жыццё натхненню не спрыяе,*
*Штодзень турботаў марных цераз край –*
*Зняверышся: душа не акрыяе,*
*Хоць ты яе нячысціку прадай.*

*За недасяжным воку небакраем*
*Жаданай выспай непазбыўны рай.*
*Ты не сябруй з самотай і адчаем,*
*А паратунку ў радасці шукай.*

*Знайдзі шляхі, з сабою каб у згодзе*
*Жыць дзень пры дні ў паганскім карагодзе,*
*Адкінь сумнеў у зверхнасці любві.*

*Спатолі знакам аркушык папер,*
*Сцяной ад свету адгародзяць дзверы –*
*На светлы плён, Гасподзь, дабраславі.*

*2004*

## ПАЭЗІЯ

*Судакрананне – як укол,*
*Што сэрца ўраз дастане.*
*Як добры знак, вястун-анёл*
*Адказам на пытанне.*

*Судакрананне з пачуццём*
*Праніклівае думкі*
*Дае энергію, зліццё –*
*Ускінь да неба ў рукі!*

*Развагі злітнасць і душы*
*Стварае шчыры вобраз.*
*Не пакрывіць і не зграшыць,*
*Калі сплялося добра.*

*Другая знойдзецца душа –*
*Твайму адкажа слову.*
*Ды тут не нам ужо рашаць,*
*Не нам тварыць замову.*

*Жыве яна сама сабой*
*Ў нябачнай наасферы,*
*Як наша вечная любоў –*
*Адбітак вечнай веры.*

*1989*

## БЕЛЫ КВАДРАТ

*Як разгадаць загадку чысціні,*
*Бясконцасці без межаў і без краю?*
*Знайсці дарогу рупіцца да раю,*
*Дзе грэх і шчасце маюць карані.*

*Спакуса недасяжнай вышыні –*
*Адзення праведнікаў край кранаю.*
*Адзіны крок – і, верыцца, спазнаю*
*Вышэйшы сэнс праяваў дабрыні.*

*Лілеі белай лекі ад нягод,*
*Адзення бель, і белы параход,*
*Куды імкну ад крыўдаў чалавечых.*

*Бязмежнасць падступае спакваля,*
*Як Боскае святло канстантаў вечных:*
*Тут Неба новае і Новая зямля.*

*2010*

## МОЙ СЫМБАЛЬ

*Голас чуйны са светлага ў цемру*
*Пругкай рысай пазначыў мяжу.*
*Крык нямы здратаванага нерву*
*Наслання прарывае імжу.*

*Гук спагаднае скрыпкі пяшчотны*
*Будзіць струны скалечаных душ.*
*Стан разгублены, кволы, самотны –*
*Ты збярыся і духам адуж.*

*Ды трымайся Яго запавету –*
*Ад зацьмення зямлю вызваляй.*
*Уваплецены ў кола сусвету*
*Сонца, голас,*
*І скрыпка, і край.*

*На Айчыне бязладдзе шугае,*
*Злу й дабру годзе поручісці.*
*Кропля высілкаў – цемра канае…*
*Але так не бывае ў жыцці.*

*Значыць, вечнага сымбаль змагання,*
*Перамогі й ахвярнасці знак.*
*Пі напоўніцу наканаванне,*
*Крыж нясі свой нялёгкі, мастак.*

*1993*

*х х х*

*Так цураецца цела душы –*
*І расце паміж імі адлегласць.*
*І пачуцці растуць – спарышы,*
*Што адзін аднаму супрацьлегласць.*

*Тоўсты-тонкі, спакой і адчай,*
*Што аб шкло непазбыўнасці б'ецца.*
*Ты яму перавагу аддай,*
*Бо калоціцца ў роспачы сэрца.*

*Бо за тлушчам і скурай якраз*
*Так утульна і так бесклапотна.*
*Відавочна знікае абраз*
*Старажытнае нашай работы.*

*Ты шляхам тупікоў не дасі,*
*Дзе балела – усё адбалела.*
*А іначай – загінеш зусім,*
*І душа адцураецца цела.*

1986

*х х х*

*Капалі калодзеж ля хаты,*
*Кадоўб за кадоўбам – углыб.*
*Хаця працавалі заўзята,*
*Дайсці да вады не змаглі.*

*І толькі ў другім ужо месцы,*
*Лагчыне, ад хаты далей,*
*Змаглі дакапацца нарэшце.*
*Ці ёсць дзе калодзеж глыбей?*

*Ці ёсць дзе смачнешай вадзіца –*
*Бурштынавы водар зямлі?*
*Здаецца, ніяк не напіцца,*
*Ці смагу спатолім калі?*

*Вось так і людзей адкрываеш –*
*Глыбей намагаешся ўзяць.*
*А іншы жыццё ўсё шукае*
*Мясціну, дзе трэба капаць.*

*1981*

## САМОТНАЯ АЛЬБА ВЕРШНІКА

*Мне прымроіўся спраўджаны сон:*
*Вершнік з ветрам ляцеў быдта птах.*
*Ён мінуўшчыне мкнуў наўздагон –*
*З ім я кінуўся ў прывідны шлях.*

*Я імчаў па гадах і вяках*
*Адшукаць летапісны сувой –*
*Паратунак, пакуль не зачах*
*Жар-агеньчык Айчыны маёй.*

*Браў прыпынак, дзе рэй на вятрах*
*Абаронцы радзімы вялі,*
*Замка ставілі велічны гмах,*
*Каб чужынцы прайсці не змаглі.*

*Спрычыніўся да слаўных мясцін,*
*Дзе ваякі на грозных канях*
*Супраць ворага ўсе як адзін –*
*Перамогі разносіцца пах.*

*Не згубіць тых дзівосных праяў…*
*Толькі што гэта? – цёмна ў вачах:*
*Замак знік, ды і конь мой прыстаў,*
*Долу нікне аброць у руках…*

*1993*


16.09.87г.


3-4.11.87г.


3 гары
08.11.05




Выгнуты клічнік
і такі ж пытальнік
1986




ВОЗЕРА,
СОСНЫ
08.04.09.


ДРЭВА. ХХ. 19.08.2010,


Шорах XX
25.03.2016.



ЗАВІХРЭННЕ. УХЛ 05.08.2013.



цяжкія кроплі 23.12.2011



УЧАПІЦЦА УХЛ 31.07.09.


звонка
29.06.2009.



У КРУЗЕ. УК. 09.08.2013.


29.09.98г.


31.12.86 год


СУПРАЦЬ ВЕТРУ
ЖЖ 02.10.08.


ВЫЛУПЛЁНИЕ
8.05.02г.



лента
XX 18.07.08.


НАРОСХРЫСТ
10.12.2011.



ТРЫМАЦЬ 29.01.09.


МВ
ВЕТРАНЫ КАКТЭЙЛЬ З ЦЫТРУСАВЫМ
12-86




ТАКІ ДЗЕНЬ

*х х х*

*Капялюш-цемязень ты надзень,*
*Стратай стань гэтай тлумнае явы.*
*Нецікава ісці да людзей –*
*Хто тут вінен? Стагоддзя праявы?*

*Што пачуеш? – вядома ж усё:*
*Вернасць, здрада, зайдроснасць людская…*
*А любоў, што ў душы мы нясём,*
*Нелюбоў у адказ сустракае.*

*Ды і тое б хаця – нейкі знак,*
*Больш жа проста нішто, раўнадушша.*
*Толькі клопат, пажыць каб усмак,*
*Каб спакой аніяк не парушыць.*

*Дык навошта ісці да людзей?*
*Сыпаць перлы, душу рваць і раніць?*
*Невідзімку на голаў надзень*
*І ўцякай у праменнае ранне.*

*1988*

# ПЯСОК І КАМЕНЬ

*Часіна роздуму надарыцца якая –*
*Куды прыбрыў на ростанях гадоў?*
*Пясок душы праз пальцы выцякае*
*І не ўтрымаць, як тую з раны кроў.*

*Сціскай кулак, ды тое ўсё дарэмна,*
*Шляхі свае не павярнуць назад.*
*Жыццё-быццё сплывае падярэмна*
*І незваротных дабаўляе страт.*

*Бязладнасць смокча моц і спадзяванне,*
*З пяску душы не пабудуеш дом.*
*Не на любоў Яго, а на змаганне*
*Расцерушыў гады свае суздром.*

*І толькі камень выратаваць можа,*
*Той, што ў падмурак ляжа,*
*Кутавы.*
*Памілуй грэшных, літасцівы Божа,*
*Каб прыхіліць было дзе галавы.*

*Яшчэ дай шанец, хоць астатні самы,*
*Сабраць каменне потам і крывёй.*
*Мо пакаяннем дабрыдзём да брамы*
*Па вузкай сцежцы любасці Тваёй.*

*1994*

## КАМНЯПАД

*Дажджы падбяруцца і ўдзень,*
*А могуць і ўночы трывожна.*
*І снег кожны раз неспадзеў*
*Наробіць паўсюль бездарожжа.*

*Сам час незваротна заўжды*
*Па хвілі ў нябыт упадае:*
*Вось толькі што быў малады,*
*Ды раптам пара ўжо не тая.*

*І толькі адзін зарапад*
*Сыходзіць бясспрэчнасцю ночы.*
*Ды зрэдку яшчэ камняпад,*
*Чаго ты не згледзіш на вочы.*

*Чаму ж толькі ноччу, скажы,*
*З руінаў і храмаў, і замкаў*
*Злятаюць каменні-глыжы,*
*А светам таго ані знаку?*

*Не хочуць вярэдзіць людзей,*
*Не бачыш – дык лёгкая памяць?*
*Датупалі краю мы, дзе*
*Масты да мінуўшчыны паляць.*

*Але напляваць, усё спім,*
*Даспімся да роспачнай долі,*
*Як моцы не стане зусім*
*Сабраць камяні больш ніколі.*

*1997*

## КАМЕННЕ

*Расцём, як на полі каменне,*
*Парэжашся – ў рукі не ўзяць.*
*Выпіхвае ўгору карэнне*
*Нас, моц не забыўшыся даць.*

*Ды толькі імкне пастаянна*
*Абграніць, абгладзіць жыццё.*
*Дажджы ды вятрыскі старанна*
*Прасуюць, нясуць забыццё.*

*А людзі пазносяць у крушні*
*На край, на задворкі, у пыл.*
*Ці звозяць далёка і скрушна,*
*Вярнуцца не змог каб, забыў.*

*Але ж вырастаем адчайна*
*На ніве пад ворыва час.*
*Чужым не адкрыецца тайна*
*Зямлі, спарадзіўшае нас.*

*1988*

# КАРДЫЯГРАМА

*Кардыяграма – сардэчная гама,*
*Лёс яе грае на струнах душы.*
*Шлях па жыцці – то пагорак, то яма,*
*Доля з нядоляю спрэс спарышы.*

*Боль і адхланне, удар і пяшчота –*
*Толькі чамусьці вось першага больш.*
*Крышыцца жорстка бяззбройная цнота,*
*Што можа стацца ад гэтага горш?*

*Хоць ты зусім не жыві і не думай –*
*Зло пераможна па свеце ідзе.*
*Вырвацца з путаў бясконцага тлуму*
*Здольны-не здольны? – адказ без надзей.*

*Сэрца баліць – і нікуды не дзецца,*
*Як не ўцякай на свой хутар жывы.*
*Хутка зямля ў пекнату апранецца,*
*Дасць супакой зеляніна травы.*

*Можа, тады ачуняеш душою,*
*Хоць на хвілінку суцішыцца кроў.*
*Светлы праменьчык гуляе з табою –*
*Злое адпрэчыць адзіна любоў.*

*2003*

## КІВАЧ

*Завядзёна рытмуе ківач –*
*Мне адлічвае час хуткаплынны,*
*Што ляціць несупынна наўскач,*
*Пазначае нястомна хвіліны.*

*Кварта поўная падае з рук,*
*На душы і няўтульна, і гола…*
*Толькі ціхі размераны гук –*
*Не прарвацца з замкнёнага кола.*

*Абыякавы злому й дабру*
*Ён у той бок хіснецца і ў гэты.*
*У ліхую нядолі пару*
*Перад жорсткім бяззбройны ты светам.*

*Хоць вазьмі малатком запусці –*
*Што дастанеш адчайным ты актам?*
*Не здабыць перамогі ў жыцці,*
*Дабрадаці ніколі.*
*Ды раптам…*

*Арытмічна заб'ецца ківач,*
*Значыць, з часам надарыцца нешта.*
*У бок светлы надзею пазнач*
*І з тугой развітайся дарэшты.*

*Бачыш, клічуць штандары ў паход –*
*Хто з мячом, ад мяча і загіне.*
*Неспадзеўкі шчаслівы зыход –*
*Воля Божая спраўджана ў сыне.*



*1996*

# СТАМЛЁНЫ РОЗДУМ

*Ненадзейная гэта замглёнасць –*
*Позняй восені смешкі ці здзек?*
*Расказаць бы каму пра стамлёнасць,*
*Што трымае (нясе) ў душы чалавек.*

*Невядома, хто ў тым вінаваты:*
*Там дастань, там прабі, там звалі…*
*Мог не ведаць узнёслы араты,*
*Што ён сеяў на гэтай зямлі?*

*Неблагое насенне, магчыма, –*
*Ды благі мы сабралі ўраджай.*
*Не спазнаеш дарэшты прычыны,*
*Хоць дасвету раздумвай-гадай…*

*Час пасеяць другое насеннне.*
*Адшукаць непазбыўна святло,*
*Што з сабою нясе ачышчэнне…*
*Ці адолее вечнае – тло?*

*1986*

# ЛІХА

*Ат, пайшло яно ўсё…*
*І пайшло яно*
*Спрэс па беламу свету гуляць,*
*Дзе прытоена, дзе непрытоена*
*Зводзіць з тропу Яго дабрадаць.*

*Чалавек, у граху новаспечаны,*
*Адгукаецца рупна ў адказ.*
*Што там думаць пра шлях свой асвечаны,*
*Калі жыцьмем адзін толькі раз?*

*І пайшло яно ўсё, і паехала –*
*Весяліся да скону душа.*
*Хто шчабеча аб міры пад стрэхамі? –*
*У нутрах толькі свіст скавыша.*

*А яно аж трасецца ад радасці:*
*Душы ўсіх да сябе сабяру.*
*Хай усе патанаюць у зайдрасці*
*У маю, у ліхую пару.*

*Як святых запаветаў пазбыліся,*
*Значыць, сёння дазволена ўсё.*
*Не згадаем, калі і маліліся,*
*Так з сабою свой бруд і нясём.*

*І пайшло яно ўсё, і не спыніцца,*
*Атрахнуцца ніяк не стае.*
*І душа дагарае нішчымніца –*
*Што рабіцьмем, браткі вы мае?*

*2011*

## ЦЁМНЫЯ СІЛЫ

*Быццамм вір – увaход. Уцягненне.*
*Дзверы моцныя крайняй мяжой.*
*Лабірынт сутарэння, скляпенні –*
*Цемра б’е проста ў вочы імжой.*

*Толькі потым разгледзішся: людзі,*
*Мітульга, разгалосіца слоў.*
*Нейк адчайна, на поўныя грудзі*
*Раскідаюць каменне размоў.*

*Сам шпурляеш і ногі сціраеш –*
*Тыя сколкі адкінь, варушы.*
*Цемра смокча нутро, адбірае,*
*Вырывае часцінкі душы.*

*А сялянскага спрыту бракуе,*
*Каб нарэшце каменне сабраць.*
*У паўцемры змаганне вякуе,*
*Тоне вечнае, словы звіняць.*

*Павяртаю – і конча на волю,*
*Дзе святло, дзе любоў, а не бой.*
*Шлях назад…*
*І трывогі даволі,*
*Калі дзверы цяпер за табой.*

*1988*

## КРОПЛЯ ПОТУ

*Наплывае штуршкамі выява,*
*Узбуйняецца роспачна твар,*
*Дзе прыпухліны скуры наяве –*
*Над вачыма ўсчыняецца гвалт.*

*Сітавіны набрыньваюць потам,*
*Крывянеюць атожылкі ўраз,*
*Скура плямамі б’ецца.*
*І ротам*
*Праглынуты нясказаны сказ..*

*Драцяныя праклёвіны шчэці,*
*Зрэнкі, быццам з карціны Далі.*
*Лоб высокі. Зацятасці вецер*
*Вокамгненна нагнаў маршчакі.*

*Цішыня  напружанасць. Дзіка.*
*Ля адхону ўжо воля твая.*
*Кропля поту – знямелага крыку –*
*Рэжа скуру лязом ручая.*

*Непрыемна, агідна, пякуча,*
*Унутры дзесьці крыўда і гнеў.*
*Неспадзеўкі маўчанне навучыць…*
*А хацеў жа сказаць.*
*Ці хацеў?*

*1988*



ПЛЫНЬ 15.03.10.


рабрыны
24.11.08.



СМЕХ ЖЛ 21.01.10.


Запытальнікі
03.02.2016.



ЛІСТАВЕЙ 04.02.2011


абарона
18.01.2016.


Сакно XX 10.08.



акуляры 20.01.2012



КІНО. УЛ 14.07.08.


санет
УМ 11.01.2010


двухкрылая птушка
26.08.87


у цэнтр
14.08.09.


Замглёны шар


сякера
22.01.10.


выгін
УХЛ 11.07.09.



праз кальцо
ЖХ 26.03.08.


ВУТАЛ
XXX 13.01.2012


УДАР XXI 14.11.2010.


знак пацалунка
22.08.2012




З УСІХ БАКОЎ АДГАРОДЖАНАЕ МЕСЦА
05.11.2005



Згадкі аб дні

25.03.08.

ХЛ



03.02.89г.


22.05.94

# Змест

І крэсліць неўсвядомлена рука... 5

**вершы**

Чырвоны радок ... 7
Воля і няволя ... 8
Шлях ... 9
Знак ... 10
Дугога не дадзена ... 11

**кампазіцыі**

Прылада ... 12
... без назвы ... 13
Хвалісты крыж ... 14
Зачапіцца ... 15
Скрыжаванне ... 16
Калі здалі "Чарнобыльскі крыж" ... 17
Кругі па вадзе ... 18
Суплёт ... 19
Абы ... 20
Пад ветрам ... 21
Пакаціўся ... 22
Лёгкасць ... 23
Парасон ... 24
Клін ... 25
Нажыўка ... 26
На трох стрыжнях ... 27
Пахіліўся ... 28
Гойданка ... 29
Стаіць ... 30
Тры кроплі ... 31
Шлях з тунэлю ... 32
Закуты ключ ... 33
Аж цвік задыміўся ... 34
Радасць вады ... 35
Двое – адзін. Амбівалентнасць ... 36

**вершы**


Крэда ........ 37
Ветрык арэляў ........ 38
Аўтапартрэт ........ 39
Вестка ........ 40
Плач немаўляці ........ 41
Растурзанасць ........ 42
Тумановае кола ........ 43
Іншасвет ........ 44
Шляхцянка-восень ........ 45
Шлях майстра ........ 46


**кампазіцыі**


Завязь ........ 47
Імклівая птушка ........ 48
... без назвы ........ 49
Танцы ........ 50
Эратычны матыў ........ 51
Пасярэдзіне ........ 52
Пункт прыпынку ........ 53
Нараджэнне ........ 54
Прысесці ........ 55
Дзіравая спакуса ........ 56
Усутыч ........ 57
Гронкі спакусы ........ 58
Свечка ........ 59
Завіхрэнні ў беларуска-савецкім жыцці ........ 60
Зачапілася ........ 61
Заглытнуў ........ 62
Тры ........ 63
Дзюба ........ 64
Кропля ........ 65
Закатаць ........ 66
Мяккая песня ........ 67
Пульхна ........ 68
Ляціць разарванае кола ........ 69
Гурбы снегу ........ 70

**вершы**
Каля краю ........................................ 71
Згадкі страчанага раю ........................................ 72
Да суладдзя ........................................ 73
Чын шляху ........................................ 74
Паэзія ........................................ 75
Белы квадрат ........................................ 76
Мой сымбаль ........................................ 77
… Так цураецца цела душы… ........................................ 78
… Капалі калодзеж ля хаты… ........................................ 79
Самотная альба вершніка ........................................ 80
**кампазіцыі**
… без назвы ........................................ 81
… без назвы ........................................ 82
З гары ........................................ 83
Отходная ........................................ 84
Выгнуты клічнік і такі ж пытальнік ........................................ 85
Мяккая флейта ........................................ 86
Возера, сосны ........................................ 87
Дрэва ........................................ 88
Шорах ........................................ 89
Завіхрэнне ........................................ 90
Цяжкія кроплі ........................................ 91
Учапіццца ........................................ 92
Звонка ........................................ 93
У крузе ........................................ 94
… без назвы ........................................ 95
Старыя віхурныя павевы пад Новы год ........................................ 96
Супраць ветру ........................................ 97
Вылупленне ........................................ 98
Лента ........................................ 99
Наросхрыст ........................................ 100
Трымаць ........................................ 101
Ветраны кактэйль з цытрусавым ........................................ 102
… без назвы ........................................ 103
Такі дзень ........................................ 104

**вершы**
… Капялюш-цемязень ты надзень… ........ 105
Пясок і камень ........ 106
Камняпад ........ 107
Каменне ........ 108
Кардыяграма ........ 109
Ківач ........ 110
Стамлёны роздум ........ 111
Ліха ........ 112
Цёмныя сілы ........ 113
Кропля поту ........ 114
**кампазіцыі**
Плынь ........ 115
Рабрыны ........ 116
Смех ........ 117
Запытальнікі ........ 118
Ліставей ........ 119
Абарона ........ 120
Акно ........ 121
Акуляры ........ 122
Кіно ........ 123
Санет ........ 124
Двухкрылая птушка ........ 125
У цэнтр ........ 126
Замглёны шар ........ 127
Сякера ........ 128
Выгін ........ 129
Праз кальцо ........ 130
Вугал ........ 131
Удар ........ 132
Знак пацалунка ........ 133
Ружа ........ 134
З усіх бакоў адгароджанае месца ........ 135
Згадкі аб дні ........ 136
… без назвы ........ 137
Закрэсленыя радкі ........ 138
**звесткі аб аўтары** ........ 143

**Уладзімір МАРОЗ** – паэт, сцэнарыст, эсэіст, празаік, кінарэжысёр.

Нарадзіўся 11 чэрвеня 1953 года ў горадзе Косава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў архітэктурны факультэт БПІ (1975), Літаратурны інстытут імя А.М.Горкага ў Маскве (1983).

Працаваў на ВТА "Інтэграл", у інстытуце "Мінскпраект", Дзяржкіно БССР, на кінастудыі "Беларусьфільм", намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Бярозка".

З 2005 года – вядучы рэдактар, дырэктар студыі "Летапіс". Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм".

Аўтар паэтычных зборнікаў "Пяшчотны дотык" (1984), "Голас", "Рэй" (абодва 1993), "Хутаранская зорка" (2002), "Дабрадаць" (2006), "Шляхцянка-восень" (2012), "Крыжы на ростанях" (2014), кніг эсэ "Беларускі храм" (2003), "Мінск. Верхні горад" (2003), "Мінск. Плошча Перамогі" (2003) "За брамай забытых мелодый" (2004), "Мінск старадаўні і малады" (4 выданні – 2002, 2003, 2004, 2006), "Магілёў" (2007) і інш.

Аўтар сцэнарыяў звыш васьмідзесяці дакументальных стужак, звернутых да гісторыі і культуры Беларусі, кінарэжысёр дакументальных фільмаў "Лазер Алфёрава" (2008), "Міфалагемы Родзіна" (2009), "Беларусьфільм 2010" і інш.

Лаурэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2015), уладальнік Ганаровай граматы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2013), нагруднага знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" (2009), медаля Беларускага саюза кінематаграфістаў "За выключныя заслугі ў беларускім кінематографе" (2009), нагруднага знака Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" "За заслугі" (2014).